Источник: "Наша слова" - 2014-04-30

# 110 гадоў з дня нараджэння Васіля Барысенкі



**БАРЫСЕНКА Васіль Васільевіч**, нарадзіўся 25.04.1904 г. у горадзе Барысаве Менскай вобласці ў сям'і чыгуначніка.

Працоўны шлях пачаў чорнарабочым на чыгунцы. У 1924 г. скончыў Барысаўскі педагагічны тэхнікум. Два гады працаваў настаўнікам у пачатковай школе. У 1929 г. скончыў літаратурна-лінгвістычнае аддзяленне Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Вучыўся ў аспірантуры пры АН БССР (1929-1932). У 1931-1941 гг. і пасля вайны да 1966 г. выкладчык Менскага педагагічнага інстытута. Адначасова з 1934 г. - навуковы супрацоўнік, а з 1937 г. - дырэктар Інстытута мовы і літаратуры АН БССР. У час Вялікай Айчыннай вайны ў дзейнай арміі ў якасці карэспандэнта армейскай газеты. У 1946-1973 гг. - дырэктар Інстытута літаратуры імя Янкі Купалы АН БССР. З 1974 г. - старшы навуковы супрацоўнік-кансультант гэтага ж інстытута. Акадэмік АН БССР, доктар філалагічных навук, прафесар. Сябар СП СССР з 1937 г.

Узнагароджаны ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга, Айчыннай вайны II ступені, двума ордэнамі Чырвонай Зоркі і медалямі.

Заслужаны дзеяч навукі Беларускай ССР (1974).

Памёр 26.07.1984 г.

Выступаў у друку з крытычнымі і літаратуразнаўчымі артыкуламі з 1932 г. Напісаў літаратуразнаўчыя працы "Францішак Багушэвіч і праблема рэалізму ў беларускай літаратуры XIX стагоддзя" (1957), "Роля рускай класічнай літаратуры ў развіцці рэалізму беларускай літаратуры пачатку XX ст." (1963, разам з В. Івашыным), артыкулы пра творчасць Я. Купалы, Я. Коласа, З. Бядулі, В. Дуніна-Марцінкевіча, Т. Шаўчэнкі і інш.

Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР імя Якуба Коласа (1980) за ўдзел у двухтомным даследаванні "История белорусской дооктябрьской литературы" і "История белорусской советской литературы".

*Вікіпедыя.*

"Наша слова". 110 гадоў з дня нараджэння Васіля Барысенкі